

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

# КУЛЬТУРА ЗЕМЛЯРОБСТВА — НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

## ААТ «Мурава» Пружанскага раёна СТАЛА ПЕРШАЙ СЯРОД ЭЛІТГАСАЎ КРАІНЫ


Збожжаачышчальна-сушыльны комплекс, які мадэрнізавалі сёлета.

**Калі гавораць аб прыгажосці поля, то маюць на ўвазе звычайна маладую пяшчотную рунь альбо жоўтае мора каласоў. А нам вось нядаўна пашчасціла ўбачыць найпрыгажэйшае, толькі што засеянае поле. Мы прыехалі ў Мураву ў канцы жніўня, і першае, што кінулася ў вочы адразу за будынкам канторы, — панарама гэтага палетка. Можа, ад таго, што поле распасцерлася не на цалкам раўніннай мясцовасці, яно выглядала не зусім звычайным, невялікая ўзгоркавасць, нібы палатно, падкрэслівала раўнюткія рады, пакінутыя сельгасагрэгатам — след нядаўняй апрацоўкі. І выглядала ўсё гэта некалькі нават урачыста, адным словам, полем хацелася любавацца.**


Лінія падрыхтоўкі зерня і насення.

## Уборка і пасяўная: некаторыя вынікі

Тут да кожнага палетка падыходзяць вось так — прафесійна і з душой. З гэтага і пачынаецца культура земляробства.

— У нас усе палі аднолькавыя, — гаворыць **дырэктар ААТ «Мурава» Пётр БІЛЕЦКІ.** — І тыя, што знаходзяцца ўздоўж дарог, і тыя, што наводдаль ад населеных пунктаў, бо нашы працаўнікі ўсё робяць па-гаспадарску, адпаведна з тэхналагічнымі патрабаваннямі. Сёлетняе жніво — ужо гісторыя, правялі яго ў даволі сціслыя тэрміны. Напрыклад, 9 жніўня ўжо жалі на прысядзібных участках. Да 19 жніўня закончылі не толькі ўборку, але і сяўбу азімага рапсу. Збожжавых і зернебабовых, дарэчы, сёлета сабралі на 600 тон больш, чым летась. Валавы збор рапсу ў параўнанні з мінулым годам склаў 116,6 працэнта. Ураджайнасць збожжавых атрымалі нядрэнную — 57,4 цэнтнера з гектара, да леташняга дабавілі 4,4 цэнтнера. Рапсавыя палеткі таксама аказаліся больш прадукцыйнымі: сабрана 42,3 цэнтнера з гектара з плюсам да леташняга — 3,1 цэнтнера.

ААТ «Мурава» займаецца вытворчасцю элітнага насення збожжавых культур, цукровых буракоў, алейнага насення рапсу, а таксама малака і адпаведна кармоў. Гаспадарка дакладна рэагуе на патрабаванні рынку, тут укараняюць новыя тэхналогіі, развіваюць новыя вытворчасці. Ужо шмат гадоў аснову тэхнічнага парка складаюць айчынныя машыны і агрэгаты, і з году ў год раслінаводчая галіна паказвае стабільна высокія вынікі.

## Да элітнага насення — адпаведны падыход

Зусім нядаўна галоўны аграном гаспадаркі пайшоў на павышэнне, яго прызначылі кіраўніком суседняга сельгаспрадпрыемства. Абавязкі **галоўнага агранома выконвае Міхаіл СЕМАКОВІЧ.** Міхаіл Георгіевіч — вопытны спецыяліст, аграномам працуе ўжо 37 гадоў, мае ўласныя напрацоўкі ў справе культуры земляробства.

З ім сустракаемся на складзе, дзе захоўваецца гатовае да рэалізацыі элітнае насенне. Летась рэалізавалі 400 тон насення азімых культур, сёлета плануюць прадаць яшчэ больш, што павінна станоўча паўплываць на эканоміку гаспадаркі. Акцыянернае таварыства купляе ў пітомніках навуковых інстытутаў насенне-суперэліту, вырошчвае на сваіх палях, атрымлівае эліту і рэалізоўвае сельгасарганізацыям вобласці і краіны. Працуюць выключна з насеннем айчыннай вытворчасці.

— Культура земляробства пачынаецца з правільнай падрыхтоўкі глебы, — гаворыць Міхаіл Семаковіч. — У гаспадарцы ёсць увесь набор тэхнікі для гэтага. Цяпер, напрыклад, праводзіцца паляпшэнне ржышча. Як толькі пачнецца прарастанне пустазелля, пачнём ворыва, затым будуць культывацыя, давядзенне глебы да кандыцыі, у тым ліку каб было роўна-прыгожа, гэта адно з агратэхнічных патрабаванняў. Ну а далей трэба своечасова і правільна правесці хімпраполку, ажыццявіць догляд палёў, які ўключае ўнясенне мікраэлементаў, іншых пажыўных рэчываў. Пры гэтым патрабуецца, каб пасевы заўсёды былі абкошаныя, падтрымліваліся контуры палёў. Менавіта захаванне тэхналогіі гарантуе атрыманне добрага ўраджаю збожжа ці іншай культуры, якія і прынясуць прыбытак прадпрыемству. Бо якаснае насенне ўсім патрэбнае.

Агратэхнічныя тэрміны сяўбы — гэта наогул святое для нашай справы, — разважае далей аграном са стажам. — Вось, напрыклад, рапс мы пасеялі літаральна за чатыры дні ў самыя лепшыя тэрміны. Зямля была падрыхтаваная, а паколькі стаяла суш, нават не праводзілі культывацыю, а толькі зрабілі прыкочванне, каб не сушыць зямлю яшчэ больш. Усходы з'явіліся дружныя, пасля дажджу робім праполку, а далей будзе праводзіцца догляд, як той казаў, па раскладзе.

Тут яшчэ важна адчуваць найлепшыя тэрміны. За гады работы прыйшоў да высновы, што да кожнай культуры, да кожнага поля павінен быць індывідуальны падыход. Заўважалі, як у фільмах пра даўніну паказваюць: селянін прыйдзе ў поле, возьме ў рукі зямлю, адчуе яе тэмпературу, тады і прымае рашэнне, ці пара сеяць. Цяпер нам у дапамогу — навукова-абгрунтаваныя распрацоўкі, высокія тэхналогіі, але ўсё роўна зямлю трэба адчуваць. Тым больш што надвор'е ў нас капрызнае, прырода нярэдка падносіць не лепшыя сюрпрызы, і трэба прызвычайвацца, рэагаваць на падобныя выклікі, тады не прагадаеш. Можна ўжо сказаць, што сёлета год выдаўся адносна спрыяльны, атрымалі добры ўраджай як збожжавых, так і рапсу. Культура земляробства — перадумова поспеху не толькі пры вырошчванні збожжавых, зернебабовых, рапсу, але і ўсёй галіны раслінаводства. Варта сказаць, што выраслі добрая кукуруза, травы для кармлення статка. Ужо збіраем трэці ўкос траў, а дзе-нідзе нават чацвёрты.

Для высокага ўраджаю ўсе фактары маюць значэнне. Напрыклад, сёлета правялі рэканструкцыю збожжасушыльна-збожжаачышчальнага комплексу. Важна, што тэхнічны парк ні разу не падвёў, машыны і механізмы спрацавалі дакладна, — гаворыць Міхаіл Семаковіч.




Выконваючы абавязкі галоўнага агранома Міхаіл СЕМАКОВІЧ дэманструе насенне, якое будзе рэалізоўвацца гаспадаркам краіны




Механізатар Анатоль САВІЦКІ ўзорвае зябліва.

## Цэх механізацыі, які не падводзіць


Механізатар Валерый САЎЧУК аглядае культыватар.

Усе, з кім давялося гаварыць у гэты дзень пра земляробчыя клопаты, добрым словам згадвалі цэх механізацыі гаспадаркі. Названы цэх з'яўляецца бадай, што адным з самых затратных падраздзяленняў сельгаспрадпрыемства. Тэхніка сёння каштуе нятанна. Але ж менавіта тэхніка забяспечвае ўвесь тэхналагічны працэс на палях і іншых вытворчых пляцоўках. І тое, што з першага да апошняга дня ўборкі ўсе камбайны адначасова выходзілі ў поле, пры гэтым амаль усе прадэманстравалі прыкладна аднолькавы намалот, сведчыць, што тэхніка працавала спраўна, без усялякіх паломак. У апошнім, несумненна, заслуга людзей, якія працуюць на машынным двары, а таксама занятыя ў падраздзяленні механізацыі.

**Начальнік мехатрада Уладзімір КАРУНАС** расказвае, што ў гэтым годзе, як і раней, папаўняецца тэхнічны парк. Атрымалі новы камбайн, кормараздатчык, касілку, пасяўны агрэгат, агрэгат-граблі. Стаўку тут робяць на пастаяннае і якаснае тэхнічнае абслугоўванне, якое праводзіцца па ўліку мотагадзін. Прайшоў агрэгат пэўную колькасць гадзін, становіцца на абслугоўванне. А сваімі майстрамі тутэйшы машынны двор можа пахваліцца. У свой час нам паказвалі адмысловую металічную «латку» на панелі аднаго з механізмаў. Калі туды не змаглі дабрацца, каб замяніць дэталь, што выйшла са строю, тутэйшыя ўмельцы прарэзалі дзірку ў металічнай панелі, правялі неабходныя маніпуляцыі і заварылі зноў — паставілі акуратную латку. Недасведчаны чалавек і не заўважыць вонкавага ўмяшальніцтва. А на такім простым, на першы погляд, вынаходніцтве сэканомілі немалыя сродкі.

Вось і новы МАЗ, які паступіў на баланс гаспадаркі ў гэтым годзе, удасканалілі пад уласныя патрэбы — нарасцілі барты кузава. Цяпер машына можа перавезці за раз большы груз. **Вадзіцель Мікалай ЧАРЭШКА**, які адпрацаваў чвэрць стагоддзя ў гаспадарцы, новым грузавіком задаволены. Ужо ў гэтую ўборку працаваў на адвозцы збожжа на машыне 2023 года выпуску. Гаворыць, што ў полі трэба быць больш манеўраным, таму працуе толькі з кузавам, а з прычэпам вазіў на збожжапрыёмны пункт зерне дзяржзаказу.

У полі, за вёскай Навасёлкі, сустракаем **механізатара Валерыя САЎЧУКА**, які праводзіць культывацыю на адным з самых магутных беларускіх трактараў МТЗ-35. Валерый Мікалаевіч яшчэ і кваліфікаваны майстар-наладчык. Трактарыст першага класа, у свой час ён скончыў курсы пры трактарным заводзе, атрымаў патрэбную кваліфікацыю. Цяпер паспяхова абслугоўвае ўсе машыны, акрамя гарантыйных, за якія адказвае прадпрыемства-вытворца.


Кіроўца Мікалай ЧАРЭШКА працуе на новым МАЗе.

Калі ў гаспадарцы святкавалі «Дажынкі», то ўшанавалі не толькі камбайнераў, вадзіцеляў, згадвалі ўсіх працаўнікоў-земляробаў, якія зрабілі ўнёсак у важкі каравай года. Сярод іх, вядома, механізатары — майстры ворыва. А гэтай работы хапае не толькі перад пасяўной ды пасля ўборкі. Заўсёды падсяваюць ці сеюць травы на корм, араць трэба і ў ходзе кормаўборкі — працэс гэты ў сельскай гаспадарцы бясконцы. Хіба зімою здараецца перапынак, тады для механізатара знаходзіцца іншая работа.



Намеснік дырэктара Аляксандр МАРКЕЧКА абмяркоўвае працоўны план з начальнікам мехатрада Уладзімірам КАРУНАСАМ і загадчыкам рамонтных майстэрняў Віталем БЕРАЗНЮКОМ.



## Паўтарагадовы запас кармоў

Яшчэ раней у гутарцы з намі Пётр Білецкі падкрэсліў, што за ўборкай, пасяўной, якія пэўны час былі на парадку дня пад нумарам адзін, земляробы ні на дзень не аслаблялі ўвагу да кормавытворчасці. На гэта аграрыяў арыентавалі і кіраўнікі дзяржавы, і кіраўнікі галіны. На розных нарадах падкрэслівалася важнасць нарыхтоўкі кармоў як перадумовы паспяховай зімоўкі жывёлы. У Мураве выраслі добрыя травы, добрая кукуруза.

На кукурузным полі застаём **агранома па кормавытворчасці Пятра ДАНІЛЮКА.** Пётр Міхайлавіч не без гонару паказвае кукурузу, якая вырасла значна большай за рост чалавека:

— Літаральна праз некалькі дзён (25 жніўня. — *Аўт.*) прыйдуць камбайны і скосяць кукурузу на сілас, — гаворыць Пётр Данілюк. — Кукурузу гэтым разам вырасцілі на 650 гектарах. Чакаем, што атрымаем не менш, чым 300 цэнтнераў з гектара зялёнай масы. Нарыхтоўка кармоў працягваецца. Закладваем сянаж у траншэі, нарыхтавана за сезон 300 тон сена.

Ужо ёсць паўтарагадовы запас грубых кармоў, заўсёды робім такі запас на выпадак неўраджайнага года, — працягвае аграном. — Сёлета вось прадаём гаспадаркам-партнёрам лішкі леташняга фуражу. Здаралася, што і мы куплялі ў суседзяў кармы, але гэта было вельмі рэдка. Стараемся нарыхтаваць і якасныя кармы, і з запасам. Выдатна разумеем, што поспехі жывёлагадоўчай галіны гаспадаркі, малако класа «экстра» фарміруецца на нашых палях, вызначаецца якасцю траў, агратэхнічнымі тэрмінамі ўборкі.

Як вядома, кармы добры гаспадар нарыхтоўвае з канца вясны да позняй восені. Так і робяць у «Мураве».


Аграном па кормавытворчасці Пётр ДАНІЛЮК дэманструе ўраджай кукурузы.

## Аб важнасці меліярацыі

— Важным кірункам у палітыцы культуры земляробства з'яўляецца клопат пра меліярацыю, — падкрэсліў **намеснік дырэктара сельгаспрадпрыемства Аляксандр МАРКЕЧКА.** — Падтрымліваем у рабочым стане меліярацыйную сістэму, бо меліяраваныя землі ў агульным аб'ёме сельгасугоддзяў займаюць немалую частку. Працягласць каналаў складае 33 кіламетры. Гаспадарка наймае спецыялістаў Пружанскага ПМС, яны абкошваюць, даглядаюць каналы, сочаць за тым, каб сістэма двухбаковага рэгулявання была ў парадку, усе шлюзы — рабочыя. Варта сказаць, што нашы партнёры адказна ставяцца да справы, іх спецыялісты выязджаюць на месца па першым закліку.

Меліярацыя — гэта справа не танная, але вельмі патрэбная ў кантэксце сучаснага земляробства. Калі многа вады, яе трэба скідваць, калі вільгаці недастаткова, шлюзы, наадварот, закрываюць. Узровень вільгаці глебы на такіх землях — адзін з найважнейшых фактараў, — падкрэслівае Аляксандр Іванавіч. — Калі б сёлета своечасова не закрылі шлюзы, такі ўраджай не атрымалі б. Таму і даводзіцца гаварыць аб важнасці меліярацыі.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Мурава» Пружанскага раёна па сучасных мерках — зусім невялікая гаспадарка, па плошчы далёкая ад цяперашніх гігантаў галіны. Але прадпрыемства трывала стаіць на нагах, устойліва развіваецца, яго працаўнікі бачаць перспектыву. Тут працуе дружны калектыў аднадумцаў — высокакваліфікаваных спецыялістаў і рабочых, якія аднолькава дбаюць аб справе. Сведчаннем таму і дасягнуты высокі вынік, які не застаўся незаўважаным на ўзроўні краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 200027333